Вашкевіч, А. Дзякуй табе, маці, за сына / А. Вашкевіч // Ленінскі сцяг (Лепель). — 1989. — 18 крас. — С. 2.

ДЗЯКУЙ ТАБЕ, МАЦІ, ЗА СЫНА

Ён быў адным з першых сярод тых савецкіх воінаў-інтэрнацыяналістаў, хто дапамагаў афганскаму народу адстойваць сваю свабоду. Ён быў першым з тых лепяльчан, якія загінулі ў баях з душманамі...

Іх у маці было чацвёра – усе малыя. І бацькі хутка не стала. Рупілася маці адна і ў доме, і па гаспадарцы, і на полі калгасным. Нялёгка было. Прывучала малых да працы. Вёска летам прачынаецца рана. Пабудзіць маці Сярожу, сярэдненькага. Той хуценька ўсхопіцца з такога цёплага, мяккага ложка – і да хлява: вядзе цялятка да статка на выган. «А дзяцёнак ты мой!» – не вытрымае якая-небудзь з вясковых жанчын, пашкадуе хлопчыка. А Сярожа ў.адказ усміхаецца. Быў ён заўсёды вясёлы, усмешка, здаецца, не пакідала яго вачэй. Да ўсяго ставіўся па-гаспадарску памяркоўна.

Параілі Антаніне Фамінічне «здаць» дзяцей у школу-інтэрнат. Заплакала маці ад такой прапановы, але згадзілася. Яе і Сярожа падтрымаў сваей нязменнай вясёласцю. «Во, добра, у горадзе буду жыць».

У школе-інтэрнаце, бачна, Сярожу падабалася. Вучыўся на выдатна, захапляўся спортам. Гэта апошняе дапамагло яму ў час службы хутка прывыкнуць да чужога надвор'я, дзе люты мароз чаргуецца з лютай спякотай, зрабіла яго вынослівым, смелым у час баявых дзеянняў.

Аб маці клапаціўся. Дае тая некалькі капеек на дарогу – не возьме іх, маўляў, няхай застануцца грошы на хлеб. А ён неяк і так дабярэцца ў горад. Вось такім ашчадным, клапатлівым рос хлопчык.

Хутка ляціць дзяцінства, хоць і нялёгкае. І вось трэба ісці служыць… Гэта быў яшчэ той час, калі пра Афганістан у нашай краіне афіцыйна больш маўчалі, чым гаварылі. А там ужо ішлі

суровыя баі, гінулі юныя воіны, якіх мы пазней назавём пачэсным іменем воіны-інтэрнацыяналісты. Цяпер рассакрэцілі многія старонкі дзевяцігадовай вайны. Мы ведаем, здаецца, усё: як яна праходзіла, колькі каштавала нам.

Хоць і зрэдку, але прыходзілі пісьмы з трохвугольнікам. Адтуль, з краю зямлі – у ціхую, мірную вёсачку на Каменшчыне. Зберагла іх маці, хоць і не ўсе. Вось яна дастае з шафы невялічкі, гадоў дваццаць назад яшчэ модны, чамаданчык. Кладзе яго на стол, расчыняе. Слёзы пабеглі з вачэй. А здавалася, што ўжо ўсе выплакала за гэтыя гады.

Як святыя рэліквіі, бярэ Антаніна Фамінічна пажоўклыя лісткі...

«Прывітанне з ДРА!

Добры дзень, дарагія родныя: мама, Міша, Віця! Пісьмо пішу вам з новага месца. Тут жыццё не маліна. Днём свеціць сонца і дзьме «афганец». Спякота. Цяпер будзем хадзіць на баявыя аперацыі. У пачатку жніўня ў нас загінуў камандзір батальёна. Вось такая ў нас абстаноўка.

Як тваё здароўе, мама? Як нага? У бальніцу яшчэ не клалася? Калі ёсць такая магчымасць, то кладзіся. А дома, я думаю, Міша з Віцькам справяцца. А ў калгасе, напэўна, ужо хлеб убіраюць».

«Прывітанне з ДРА!..

...Жыву я, можна сказаць, добра. Служба ідзе. Хутка праляцеў год. Добра было б, каб і другі таксама хутка прайшоў. Цяпер у нас спякота самая сапраўдная.

Сталі падымаць галовы душманы: то горад абстраляюць, то савецкую калону. Нядаўна бачыў трох забітых салдат з колоны КамАЗаў. У гэтыя мінуты падумаў, што і мяне ў любы час могуць вось так. Але ж трэба і тут камусьці быць».

«Добры дзень, дарагія родныя!..

Ты, мама, баялася. каб я не трапіў на Поўнач ці ў Сібір, туды, дзе халодна. А выйшла так, што я папаў туды, дзе сама горача. Цяпер у нас у горадзе ціха. Душманы супакоіліся, бачна, да зімы рыхтуюцца…»

«Добры дзень, дарагія родныя!..

...Сумаваць тут не даводзіцца. Нядаўна пацаны нашага ўзводу трапілі ў перастрэлку. Ехалі, а тут засада. Давялося ўступіць у бой. Траіх улажылі душманаў. Нашы засталіся жыць. За гэты бой лейтэнанта прадставілі да ордэна Чырвонай Зоркі, а салдат – да медалёў. Душманы ўсё нахабней дзейнічаюць».

«Прывітанне з ДРА!..

...Тут, у Афганістане, у нас ужо спеюць персікі. Хутка паспеюць дыні і кавуны. І так круглы год. А ў вас таксама ўжо лета. Усё расце, кругом зелень. Шкада, што мяне з вамі няма».

Салдацкія пісьмы... Кароткія, дакладныя думкі. У кожным слове адчуваецца, што Сяргей верыў, што хутка прыйдзе ў родную вёску, да маці. Вось ужо і шлях выбраў, па якому пойдзе пасля

звальнення ў запас – вадзіць цяжкагрузныя аўтамабілі, адзін з якіх ён водзіць па небяспечных на кожным метры афганскіх дарогах, марыць аб каханні. Нездарма ж бачна, так часта ў пісьмах гучаць словы «вяселлі», «вясна».

«*На вяселлі ва Усовіках, я пазнаёміўся з дзяўчынай Таняй (шчыра дзеліцца патаемным з сябрам). Гэта быў шчаслівы час. З Таней мы перапісваемся. Я, канечне, не веру ў тое, што яна мяне дачакаецца. Але хацелася б*».

Часцей стала трапляцца слова «дэмбель».

«*Ужо вось, здаецца, пайшоў лік на дні. Трэба і пра падарункі падумаць. Першы, самы лепшы – для маці купіў: квяцістую хустку. Яна любіла такія насіць.*

А там – бывай, Афган. Добры дзень, родная Беларусь! »

Толькі смерці і секунды хапае.. Загінуў Сяргей у апошнія дні службы: чарга душмана прашыла яму грудзі.

Труну з целам салдата прывезлі адтуль. Ускрыкнукла і ўпала маці. Залілася слязамі... Пахавалі Сярожу Аўтуха на мясцовых могілках неяк прыцішана. Быццам і не героя пахавалі. Чатыры гады заставалася Антаніна Фамінічна адзін на адзін са сваім невычэрпным горам. І толькі потым ужо, калі пра Афганістан сказалі ўсю праўду, зачасцілі ў хату. Паспачувалі, раздзялілі гора. Але, праз час зноў быццам бы забыліся пра хату на ўскрайку вёскі, і пра тое, што тут жыве маці загінуўшага «афганца». Ніяк не дабяруцца вяскоўцы дашаляваць хату, загарадзіць агарод. А ўжо колькі нахадзілася Фамінічна, якая і ходзіць ледзь-ледзь на хворых нагах, за тым шыферам, каб накрыць хлявок, дык і ўспамінаць прыкра. А трэба. Заўсёды святая для нас усіх маці, якая выхавала героя-інтэрнацыяналіста. Давайце скажам ёй: дзякуй табе, Антаніна Фамінічна, за сына.

Я развітаўся з маці з пачуццём сыноўняга доўгу перад ёй. Выйшаў на вуліцу. Акінуў вокам хату, сядзібу Аўтухаў. І зноў думка вярнулася ў паўсядзённасць. Не хапае тут Сярожы. Ён бы і дзверы прасёк у бакавой сцяне, каб маці зручней было хадзіць у хлеў да каровы, і хату дашаляваў, пафарбаваў яе. Словам, падладзіў бы сядзібу, як след. Як гаспадар.

Не ўбачыў я на сцяне зорачкі, якую ў розных кутках Беларусі даводзілася бачыць, дзе жывуць удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. Мне здаецца, што такой зорачкі тут не хапае, вельмі.

Кім бы стаў Сярожа? Цяжка сказаць дакладна. Адно ведаю: добрым, працавітым чалавекам, такім, якім яго выхавала маці, школа-інтэрнат.

Сёння над магілай Сяргея Уладзіміравіча Аўтуха стаіць чорная мармуровая пліта. Здалёк бачна яна, вельмі здалёк. Давайце будзем часцей прыходзіць да яе.

А. Вашкевіч

На здымку: у час провадаў у армію (Сяргей злева)